УДК 94(476–25)«1917»:82–94

М. Я. Сяменчык, дацэнт (БДТУ)

# ПАДЗЕІ Ў МІНСКУ НАПРЫКАНЦЫ КАСТРЫЧНІКА – ПАЧАТКУ ЛІСТАПАДА 1917 Г. У АСВЯТЛЕННІ ГІСТАРЫЧНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

У артыкуле аналізуецца гістарычная літаратура, прысвечаная пытанням Кастрычніцкай рэвалюцыі. Аўтар характарызуе палітычнае становішча ў краіне (у тым ліку на Беларусі) перад выбарамі Устаноўчага схода. Таксама разглядаецца дзейнасць Камітэта выратавання рэвалюцыі, які быў утвораны ў сувязі з паўстаннем петраградскага гарнізона і рабочых супраць Часовага ўрада. Асаблівая ўвага надаецца часу і абставінам прыходу бальшавікоў да ўлады ў Мінску.

The article analyzes historical books devoted to the questions of the October revolution. The author characterizes the political situation in the country (including Belarus) before the elections to the Con-stituent Assembly. The activity of the Revolution Salvation Committee wich was set up in connec-tion with the armed revolt of Petrograd garrison and workers forces against the Provision Government is dealt with as well. Time and circumstances of Bolsheviks' accession to power in Minsk are specified.

**Уводзіны.** Да пачатку 1990-х гг. партыйныя, у тым ліку беларускія, даследчыкі рэвалюцыйных падзей восені 1917 г. акцэнтавалі ўвагу на вызначальнай ролі ў іх рабочага класа ў саюзе з бяднейшым сялянствам на чале з партыяй бальшавікоў. Адначасова пазітыўная дзейнасць Часовага ўрада, небальшавіцкіх партый і падначаленых ім Саветаў, якія прытрымліваліся дэмакратычнага шляху пераўтварэння Расіі, не вывучалася. Як і ў жыцці, усе, хто паўставаў на шляху бальшавікоў ці нават разыходзіўся з імі па ідэйных меркаваннях, так і ў гістарыяграфіі, набывалі кляймо контррэвалюцыянераў. Даволі выразна такі падыход партыйных гісторыкаў (былых і дзеючых) выявіў сябе ў адносінах да ўдзельнікаў грамадска-палітычнага аб'яднання «Камітэт выратавання рэвалюцыі (КВР) Заходняга фронту», які ўзнік у Мінску ў сувязі з узброеным паўстаннем ў Петраградзе 25 кастрычніка 1917 г. Характэрна, што ўсе без выключэння аўтары звязвалі пачатак «трыумфальнага шэсця Савецкай улады» на Беларусі менавіта з 25 кастрычніка, калі, на іх думку, у Мінску гэтую ўладу ўзяў у свае рукі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў [1], [2], [3], [4], [5], [6], [7], [8], [9], [10], [11], [12], [13].

Пэўныя змены ў ацэнках падзей 1917 г. адбыліся пасля краху ўсеўладдзя КПСС і ўсталявання дэмакратычнага рэжыму на Беларусі. У прыватнасці, М. С. Сташкевіч у ліку першых заявіў аб тым, што 25 кастрычніка адбылася не рэвалюцыя, а пераварот, які «быў здзейснены бальшавікамі ў разліку на непасрэдную падтрымку сусветнай пралетарскай рэвалюцыі» [14]. Акадэмік І. М. Ігнаценка першым у краіне адкінуў палажэнне аб сацыялістычным характары Кастрычніцкай рэвалюцыі [15]. П. К. Башко звярнуў увагу на грамадска карысны характар дзейнасці КВР і выказаў меркаванне аб тым, што члены камітэта з'яўляліся не контррэвалюцыянерамі, а апазіцыяй новай уладзе [16].

У канцы XX – пачатку XXI ст. гэтае пытанне закранаяся ў творах іншых аўтараў [17], [18], [19], [20], [21], [22], [23], [24], [25], [26], [27], але памылкова вызначаная дата ўзяцця Мінскім Саветам (25 кастрычніка) улады засталася дамінуючай, роўна як і погляд на сутнасць барацьбы паміж КВР і бальшавікамі. Комплексны аналіз літаратуры і выкарыстанне дакументальных крыніц дае магчымасць пераадолець партыйныя стэрэатыпы ў гэтым пытанні і прадухіліць іх выкарыстанне ў навуковых публікацыях Рэспублікі Беларусь.

**Асноўная частка.** Восенню 1917 г., нягледзячы на сацыяльна-эканамічныя цяжкасці і палітычныя супярэчнасці ў грамадстве, аб'ектыўных передумоў для новай рэвалюцыі ў Расійскай рэспубліцы не існавала. Нягледзячы на працяглы палітычны і эканамічны крызіс, у кастрычніку паўсюдна, у тым ліку на Беларусі, пачалася перадвыбарчая парламенцкая кампанія. Апошняй місіяй Часовага ўрада заставалася скліканне Устаноўчага схода і перадача яму вышэйшых уладных паўнамоцтваў.

Да ўлады, як і члены ўсіх палітычных партый, імкнуліся і бальшавікі, але, у адрозненне ад іншых, асноўную стаўку па ажыццяўленні сваёй мэты яны рабілі на ўзброенае паўстанне пад лозунгам «Уся ўлада Саветам». Усе астатнія партыі, як правыя, так і левыя, хоць і лічылі Саветы ўплывовай сілай, але ў сістэму будучых дзяржаўных органаў іх асобна не ўключалі, надаючы перавагу дэмакратычна абраным гарадскім і земскім самакіраванням. Таму падрыхтоўка II з'езда Саветаў выклікала значна менш увагі грамадскасці, чым Устаноўчы сход. Менавіта з яго скліканнем звязвала спадзяванні на лепшае (заключэнне міру, спы-

ненне разрухі, ажыццяўленне рэформ, самавызначэнне народаў і інш.) падаўляючая большасць расійскага грамадства, у тым ліку беларусы. Па гэтай прычыне нават «рэвалюцыйная дэмакратыя» не выявіла вялікай зацікаўленасці да II з'езда Саветаў (а сялянства наогул яго ігнаравала!) і скіравала свае намаганні на передвыбарчую кампанію ва Устаноўчы сход [23, с. 156].

Па меры набліжэння выбараў уплыў Часовага ўрада на палітычнае жыццё імкліва зніжаўся. Прэм'ер-міністр А. Керанскі страціў крэдыт даверу ў большасці грамадзян і яўна недаацэньваў небяспеку бальшавіцкага паўстання ў Петраградзе, аб падрыхтоўцы да якога адкрыта гаварылася ў прэсе. Першапачаткова выступленне бальшавікоў чакалася 20 кастрычніка, у дзень адкрыцця II Усерасійскага з'езда Саветаў, і гэта выклікала моцную маральна-псіхалагічную напружанасць у краіне. У прыватнасці, у буйнейшых гарадах Беларусі сталі фармавацца антыпагромныя камітэты [23, с. 172], [29]. Адзін з такіх, пад назвай Рэвалюцыйны штаб [30] (па іншых звестках – КВР), стаў дзейнічаць у Мінску на базе Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў [26, с. 153]. Але аб дэталях паўстання і спосабах перадачы ўлады не ведаў нават старшыня Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП (б) А. Мяснікоў [13, с. 137]. Гэты факт, акрамя іншага, лішні раз сведчыць аб адсутнасці, як суб'ектыўных, так і аб'ектыўных, перадумоў рэвалюцыі.

Вестка аб узброеным паўстанні часцей петраградскага гарнізона і атрадаў рабочых на чале з Ваенна-рэвалюцыйным камітэтам (ВРК) Петраградскага Савета супраць Часовага ўрада з'явілася ў Мінску да поўдня 25 кастрычніка. Удзельнікі з'езда сялянскіх дэпутатаў Заходняга фронту 257 галасамі «за», 23 – «супраць» прынялі рэзалюцыю з асуджэннем «спробы ўзняць у краіне міжусобную грамадзянскую вайну, якая можа толькі сарваць выбары ва Устаноўчы сход і паслужыць на карысць контррэвалюцыі, далейшай разрусе» і г. д. [31].

У той самы дзень аналагічная рэзалюцыя была прынята на пасяджэнні Выканкама Заходняга фронту (Выкамзах). Прысутныя вырашылі па ўзору петраградскай грамадскасці ўтварыць Камітэт выратавання рэвалюцыі Заходняга фронту ў мэтах захавання парадку і спакою на фронце, у Мінску і ва ўсім тыле [32].

26 кастрычніка весткі аб арышце Часовага ўрада і пастановах II Усерасійскага з'езда натхнілі мясцовых бальшавікоў на ўсталяванне ўлады Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, якая да гэтага часу належала гарадской думе. З гэтай нагоды яны вызвалілі з турмаў і гаўпт-вахтаў горада каля 800 арыштаваных вайскоўцаў і сфармавалі I рэвалюцыйны імя Мінскага Савета полк. «Рабочых і сялян» [27, с. 36] сярод іх не было. На пошту, тэлеграф і ў штаб Заходняга фронту былі накіраваны каравулы.

26 кастрычніка (а не 25, як лічыць большасць аўтараў) [3], [4], [5], [6], [7], [8], [9], [10] [11], [12] у другой палове дня бальшавікі ад імя Выканкама Савета абвясцілі загад № 1 «Да насельніцтва г. Мінска і яго наваколляў», дзе, акрамя іншага, паведамлялася пра пераход улады да Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Аднак тады ж на пашыраным пасяджэнні названага органа члены небальшавіцкіх фракцый выказалі катэгарычнае патрабаванне скасаваць загад на той падставе, што апошні з'явіўся без іх санкцыі. Яны ж абвясцілі агульную рэзалюцыю з асуджэннем перавароту [2, с. 112].

Аднак бальшавікі працягвалі дзейнічаць ад імя ўсяго Савета: усталявалі цэнзуру перыядычнага друку, здзяйснялі арышты тых, хто распаўсюджваў антыбальшавіцкія матэрыялы.

Да раніцы 27 кастрычніка стала вядома, што армейскія камітэты ўсіх трох армій выказаліся за асуджэнне бальшавіцкага перавароту. З гэтай нагоды па просьбе Выкамзаха 27 кастрычніка паміж 14 і 15 гадзінамі ў Мінск былі ўведзены часці 2-й Каўказскай дывізіі (па іншых звестках – у ноч на 27) [26]. Бальшавіцкія каравулы былі выведзены з занятых імі ўстаноў. Свабода друку была адноўлена.

Увечары, 27 кастрычніка, на пашыраным пасяджэнні Выкамзаха была вызначана кампетэнцыя КВР як калектыўнага органа часовай улады ў Мінску і на Заходнім фронце. Бальшавіцкі прэзідыум Савета абяцаў яму падпарадкавацца на ўмовах непрызнання Петраградскага ВРК, непасылкі войск на Петраград і Маскву, раззбраення I рэвалюцыйнага палка. Было падкрэслена, што «пытанне аб уладзе вырашаецца не ў Мінску і не на Заходнім фронце, а ў сталіцах» і да канчатковага высвятлення сітуацыі ўлада ў горадзе і на месцах будзе належаць КВР [24, с. 7–12].

У выніку Савет, пацвердзіўшы сваю лаяльнасць КВР, як самастойная ўладная структура перастаў існаваць. З гэтай нагоды бальшавікі былі вымушаны стварыць новы цэнтр барацьбы за ўладу – ВРК (старшыня А. Мяснікоў) [33]. 27 кастрычніка ў радыёграме да франтавікоў бальшавікі паведамілі пра «бяскрыўны пераварот» у Петраградзе і Маскве, пра дэкрэты аб міры і зямлі, а таксама заклікалі «перакульваць праціўныя камітэты, ствараць новыя» на грунце падтрымкі ленінскага Савета Народных Камісараў. У сваю чаргу, першы загад КВР ад 28 кастрычніка, пад якім падпісаліся 19 арганізацый, абвяшчаў распараджэнні

Петраградскага ВРК на Заходнім фронце і ў прыфрантавой паласе скасаваным і непадлеглым выкананню [24, с. 10].

Вызначальную ролю ў змяненні балансу сіл на карысць ВРК адыгралі звесткі аб разгроме 29–30 кастрычніка войск Керанскага – Краснова. З гэтага часу на Заходнім фронце усе, хто процістаяў бальшавікам, абвяшчаліся «карнілаўцамі», «контррэвалюцыянерамі» і г. д.

Дзякуючы актыўнай дзейнасці бальшавіцкіх агітатараў на фронце, некаторыя часці II арміі выказалі гатоўнасць аказаць ім узброеную дапамогу. Так, у ноч на 1 лістапада ў Мінск прыбыў бліндзіраваны цягнік «для абароны Савета», што дало магчымасць мясцовым бальшавікам парваць усе дамовы з КВР і выйсці з яго складу. 2 лістапада, увечары, на пашыраным пасяджэнні Мінскага Савета А. Мяснікоў заявіў пра неабходнасць «пакончыць са здрадніцкім камітэтам выратавання і пачаць працу рабоча-сялянскага ВРК». Але абвешчаная ім рэзалюцыя ў падтрымку ленінскага СНК выклікала нязгоду небальшавіцкіх дэпутатаў мясцовага Савета, а прадстаўнік КВР пацвердзіў яго (камітэта) намер ажыццяўляць вышэйшыя ўладныя функцыі да сфарміравання ў сталіцы агульнага сацыялістычнага ўрада. Але рабіць гэта даводзілася ўсё цяжэй, бо камітэты II, III і X армій усталі на бок ВРК.

Нават галоўнакамандуючы Заходнім фронтам П. Балуеў запэўніў апошні ў тым, што да ўстанаўлення новай улады ў Расіі і навядзення парадку ён не будзе ўступаць ні ў якую палітычную барацьбу. Са свайго боку ВРК у загадзе ад 6 лістапада распарадзіўся «з прычыны распаду Камітэта выратавання аб’явіць яго распушчаным, а яго загады непадлеглымі выкананню». Старшыня КВР Т. Калатухін і франтавы камісар У. Жданаў былі арыштаваны, але праз колькі дзён – вызвалены [24, с. 12]. Па прапанове вядомага дзеяча С. Каваліка, гарадская дума ўзяла на сябе клопат аб «абароне горада і выратаванні рэвалюцыі».

Пасля адмовы 6 лістапада І. Метліна ад пасады губернскага камісара буйнейшай урадавай асобай звергнутага рэжыму заставаўся галоўнакамандуючы фронтам. Лаяльнае стаўленне П. Балуева да ВРК не ўратавала яго ад рэпрэсій. З прычыны адмовы пачынаць перагаворы з праціўнікам аб міры генерал быў адхілены ад пасады. 12 лістапада да выканання абавязкаў галоўнакамандуючага фронтам прыступіў бальшавік В. Каменшчыкаў. Менавіта з гэтага часу ўся ўлада ў горадзе і наваколлях сканцэнтравалася ў ВРК пад старшынствам К. Ландэра. Ён жа ўзначальваў і Мінскі Савет, які толькі фармальна лічыўся органам улады [24, с.13].

Процістаянне шматпартыйнага КВР і бальшавіцкага прэзідыума Савета скончылася на карысць апошняга. Канчатковая перамога петраградскіх бальшавікоў сталіцы абумовіла распад усіх мясцовых КВР. Роля працоўных мас ва ўсталяванні Савецкай (дакладней, бальшавіцкай) улады на Беларусі была нязначнай.

**Заключэнне.** Асэнсаванне ўзаемаадносін КВР Заходняга фронту, бальшавікоў Савета і Заходнефрантавога ВРК залежыць ад ацэнкі падзей, якія адбыліся ў Петраградзе 25–26 кастрычніка 1917 г. Агульнавядома, што тагачасная грамадскасць успрыняла іх як спробу чарговага бальшавіцкага перавароту, які паграажаў пагромамі, грамадзянскай вайной і пагібеллю рэвалюцыйных заваёў [34]. З усведамленнем таго (а не для абароны Керанскага!) [22, с. 189] ва ўсіх гарадах рэспублікі, у тым ліку на Беларусі, грамадскасць аб’яднаналася ў КВР.

Спроба асобных аўтараў уключыць народныя масы ў кола ўдзельнікаў перавароту ў сталіцах і на месцах і тым надаць гэтай акцыі маштаб рэвалюцыі, даволі няўдалая, як і тэзіс наконт таго, што Кастрычніцкая рэвалюцыя – гэта «сацыяльная рэвалюцыя, у ходзе якой да ўлады прыйшла партыя бальшавікоў» [28, с. 552]. Па такой логіцы, у Мінску пачынальнікамі рэвалюцыі былі дзеячы КВР. Але ж гэта не так. Яна адбылася пазней, калі бальшавікі, пасля заваявання ўлады ў выніку перавароту (галоўным чынам з апорай на армію), сваёй далейшай палітыкай прывялі да радыкальных змен ва ўсіх сферах жыццядзейнасці грамадзян Расіі, у тым ліку Беларусі, аб чым справядліва казаў Прэзідэнт А. Р. Лукашэнка 6 лістапада 2009 г. у сваім віншаванні суайчыннікаў з нагоды Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі [35].

Выдаваць скрупулёзна спланаванае ЦК РСДРП(б) і своечасова здзейсненае ўзброенае паўстанне за «попытку трудового народа вырваться из цепи политических и социально-экономических противоречий, обусловленных тогдашним уровнем рыночных отношений и усугубленных мировой войной» [36, с. 71], могуць толькі тыя аўтары, для якіх гістарычны факт не асноўны аргумент у іх творчасці.

Таксама няма падстаў для таго, каб лічыць удзельнікаў Заходнефрантавога КВР контррэвалюцыянерамі і нават апазіцыянерамі, паколькі іх асноўнай задачай заставалася падтрыманне звычайнай жыццядзейнасці ў Мінску і ў дзеючай арміі. Азначаныя факты і палажэнні павінны заняць належнае месца ў сучаснай гістарыяграфіі і вучэбных дапаможніках, што дасць магчымасць, акрамя іншага, пазбавіцца ад састарэлай партыйна-савецкай канцэпцыі рэвалюцыйных падзей 1917 г. на Беларусі [37].

**Літаратура**

1. Кнорин, В. Г. 1917 год в Белоруссии и на Западном фронте / В. Г. Кнорин // Под красным знаменем Октября: воспоминания участников рев. событий в Белоруссии в период Великого Октября / сост. В. П. Осмоловский [и др.]. – Минск: Беларусь, 1987. – С. 25.

2. Киржниц, А. Октябрьские дни в Белоруссии / А. Киржниц // Пролетарская революция. – 1927. – № 12. – С. 98–120.

3. Гапоненко, Л. Солдатские массы Западного фронта в борьбе за власть Советов (1917 г.) / Л. Гапоненко. – М.: Госиздат, 1953. – 196 с.

4. Каменская, Н. Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя і ўтварэнне БССР / Н. Каменская. – Минск: Выдавецтва АН БССР, 1954. – 184 с.

5. Ивашин, В. Г. Великий Октябрь в Минске / В. Г. Ивашин. – Минск: БГУ, 1957. – 168 с.

6. Ивашин, В. Победа Великой Октябрьской социалистической революции на Западном фронте / В. Ивашин // Великий Октябрь – торжество идей марксизма-ленинизма: материалы науч. конференции, состоявшейся в Институте истории партии при ЦК КПБ в сентябре 1967 года. – Минск: Беларусь, 1970. – 240 с.

7. В борьбе за Октябрь в Белоруссии и на Западном фронте / под ред. Н. А. Халипова, Н. М. Мешкова. – Минск: Гос. изд-во БССР, 1957. – 372 с.

8. Игнатенко, И. М. Беднейшее крестьянство – союзник пролетариата в борьбе за победу Октябрьской революции (1917–1918 гг.) / И. М. Игнатенко. – Минск: Изд-во Мин-ва высшего, среднего специального и профессионального образования БССР, 1962. – 500 с.

9. Победа Советской власти в Белоруссии / редкол.: И. И. Минц [и др.]. – Минск: Наука и техника, 1967. – 507 с.

10. Почанин, С. Историей обреченные / С. Почанин. – Минск: Беларусь, 1977. – 288 с.

11. Сташкевич, Н. С. Приговор революции. Крушение антисоветского движения в Белоруссии 1917–1925 / Н. С. Сташкевич. – Минск: Университетское, 1985. – 304 с.

12. Большевики Белоруссии в борьбе за победу Октября / А. С. Король [и др.]. – Минск: Беларусь, 1987. – 271 с.

13. Под красным знаменем Октября: воспоминания участников рев. событий в Белоруссии в период Великого Октября / сост. В. П. Осмоловский [и др.]. – Минск: Беларусь, 1987. – 287 с.

14. Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции / под ред. Э. М. Энтина. В 3 ч. Ч. II: У истоков политического противостояния (материалы и документы по истории общественных движений и политических партий Республики Беларусь). – Гомель: Белорус. агентство науч.-техн. и деловой информации, 1993. – 228 с.

15. Ігнаценка, І. М. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі: асаблівасці і вынікі / І. М. Ігнаценка. – Мінск: БелНДЦДАС, 1995. – 270 с.

16. Башко, П. Контрреволюционеры или оппозиционеры / П. Башко // Крыжовы шлях: дапаможнік для вывучаючых гісторыю Беларусі. – Минск: Згода, 1993. – С. 167.

17. Сяменчык, М. Я. Грамадска-палітычнае жыццё ў Мінску (сакавік – кастрычнік 1917 г.) / М. Я. Сяменчык. – Мінск: БДПУ, 1994. – 112 с.

18. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М. П. Касцюк [і інш.]. – Мінск: Беларусь, 1995. – Ч. 2. – 560 с.

19. Кастрычніцкая рэвалюцыя // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя, 1997. – Т. 4. – С. 139.

20. Сяменчык, М. Я. Камітэт выратавання рэвалюцыі Заходняга фронту // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя, 1997. – Т. 4. – С. 49–50.

21. Круталевіч, В. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917–1945 гг.) / В. А. Круталевіч, І. А. Юхо. – Мінск: Беларуская навука, 1998. – 238 с.

22. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. – Мінск: БелЭн, 2000. – 432 с.

23. Сяменчык, М. Я. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 – сакавік 1918 гг.): у 2 ч. / М. Я. Сяменчык. – Мінск: БДПУ, 2001. – Ч. 1: Грамадска-палітычнае жыццё ва ўмовах дэмакратычнага рэжыму. – 200 с.

24. Сяменчык, М. Я. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 – сакавік 1918 гг.): у 2 ч. – Мінск: БДПУ, 2001. – Ч. 2: Грамадска-палітычнае жыццё ва ўмовах складвання таталітарнага рэжыму. – 160 с.

25. Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі: дапаможнік / У. Р. Казлякоў; пад рэд. Л. В. Лойкі. – Мінск: ТАА ЦІПР, 2003. – 348 с.

26. Солский, В. 1917 год в Западной области и на Западном фронте / В. Солский; науч. ред. С. Н. Хомич. – Минск: Тесей, 2004. – 224 с.

27. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг. /А. Вабішчэвіч [і інш.]; рэдкал. М. Касцюк (гал. рэдактар) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2006. – 613 с.

28. Рудович, С. Октябрьская революция 1917 г. в Беларуси: Энциклопедия: в 6 т. / редкол. Г. П. Пашков [и др.]. – Минск: БелЭн, 2007. – Т. 5. – 752 с.

29. Бобруйский курьер. – 1917. – 20 окт.; Луч. – 1917. – 20 окт.; Витебское слово. – 1917. – 24 окт.

30. От президиума Минского Совета рабочих и солдатских депутатов // Минская газета. – 1917. – 26 окт.

31. НАРБ. – Фонд. 60. – Воп. 3. – Спр. 339. – Л. 18.

32. К восстанию в Петрограде // Социалист-революционер. – 1917. – 26 окт.

33. Кнорин, В. Октябрьские дни в Западной области // Звезда. – 1918. – 7 нояб.

34. Тревожно // Минская жизнь. – 1917. – 27 окт.; Слухи // Могилёвская жизнь. – 1917. – 28 окт.; Безумная авантюра // Луч. – 1920. – 28 окт.; Ликвидация движения большевиков // Мстиславский голос. – 1917. – 29 окт.

35. http://www.president.gov.by/by/press78996 html.

36. Российские и славянские исследования: науч. сб. / редкол.: А. П. Сальков, О. Я. Яновский (отв. редакторы) [и др.]. – Минск: БГУ, 2009. – Вып. 4. – 226 с.

37. Сяменчык, М. Я. Асвятленне рэвалюцыйных падзей 1917 года ў сучаснай вучэбнай літаратуры / М. Я. Сяменчык // Гуманітарна-эканамічны веснік. – 2009. – № 4. – С. 77–84.

*Паступіў 02.04.2010*